■ Народны гумар

# САЛОМУ ЕШ, А ФАСОН ТРЫМАЙ,

## або Дубінскія жартачкі

**Восьмы раз на Валожыншчыне прайшло раённае свята гумару «Дубінскія жартачкі». Трапіць сюды можна было толькі праз мытню. Кожнага ўдзельніка, госця рэгістравалі: ставілі пячатку на далонь або запясце рукі. Як жартавалі дубінцы, гэтая адзнака дае права наведаць нават Еўрасаюз — ніякая віза не патрэбная. А яшчэ ўсім уручалі дубінскую нацыянальную валюту — 100 долараў, маўляў, мы не разменьваемся на драбязу.**



Фота Валянціны КРАЎНЕВІЧ.

— Чаму менавіта ў вёсцы Дубіна Баярская ладзіцца фестываль такога кшталту? — пацікавілася ў Тамары Каляды, мясцовага культработніка, вельмі нераўнадушнага да роднай спадчыны чалавека.

— У 1909 годзе збіральнік беларускага фальклору, паэт і публіцыст Стары Улас у сваёй кнізе напісаў літаральна наступнае: «Дзесяць вёрст ад Валожына ёсць вялікае сяло Дубіна, і чутна аб ім далёка-далёка. Мае яно, мусіць, з 300 хат, ёсць там і манаполька, і карчма. Народ вельмі паганы, самыя п'яніцы і зладзеі: не толькі што на дварэ нічога не пакінь, але і з будынку павыцягваюць. У мінулым годзе дык выцягнулі ў Януліка Паўлоўскага з пуні сячкарню, яна і прапала. У кудраўскага лесніка Максіма пазнікалі калёсы з восяў... А пабіць каго, дык гэта ў іх нават мода: няхай толькі будзе хто на каго злы або другі папросіць, дык нападуць ці на полі, ці на дарозе, і забіваюць да паўсмерці — ідзі ў Дубіну, там усё гэта знойдзеш...» Мне ж захацелася развеяць гэты міф. Так, Стары Улас убачыў нас тымі вачыма і, магчыма, меў рацыю. Але з таго часу прайшло стагоддзе, змянілася жыццё, людзі сталі іншымі, — кажа Тамара Каляда.

Менавіта Тамара Уладзіміраўна стала родапачынальніцай фестывалю, каб паказаць, што не такія дрэнныя яе землякі: самакрытычныя, жартаўлівыя, могуць пасмяяцца над сваімі недахопамі. (Зрэшты, у каго іх няма?)

Дубінцы заўсёды жылі па прынцыпе: салому еш, а фасон трымай. Гэтую рысу характару прыкмеціў пісьменнік Уладзімір Ліпскі і падказаў Тамары Уладзіміраўне трапную назву для гурта народнага гумару — «Дубінскія фанабэры».

Цяпер жыхары вёскі, вядома, салому выкарыстоўваюць хіба што на подсцілку жывёле, ёсць у іх і хлеб, і да хлеба. Адкрытае акцыянернае таварыства «Дубінское-Агра» — даволі моцная гаспадарка, трымае першае месца ў раёне па надоях малака. З 1995-га ўзначальвае яе Генадзь Каспяровіч. А наогул Генадзь Вацлававіч тут ужо трыццаць два гады, пачынаў працоўную дзейнасць з розных пасад. «Ці задаволены вы працаўнікамі? Няма сярод іх гультаёў, лайдакоў, паганых людзей, як пісаў Стары Улас?» — пацікавілася ў дырэктара.

— Людзі добрыя, працавітыя, шчырыя, гасцінныя. Да нас прыязджаюць замежныя турысты, у тым ліку і з Германіі. **Было тое ці не, а дубінцы дасюль расказваюць байку, нібыта ў вайну немцы праехалі праз вёску толькі адзін раз, ды і то з перапуду крычалі: «Ахтунг, ахтунг, Дубіна!»**

Тым часам свята віравала, гуло: песні, прымаўкі, жарты, гумарэскі так і сыпаліся вакол. Госці і гаспадары падымалі келіхі за «лося» (каб кахалася, вялося, былося). Налягалі на сала, ад якога «душа скакала». А мяне пачаставалі «салоніцай» — бульбай, «фрыштыкамі» — печывам і «рыфмай» — чаркай гарэлкі і бутэрбродам з салам.

Павіншаваць жыхароў са святам прыехалі суседзі: гурты з вёскі Мікалаеўшчына Стаўбцоўскага раёна «Коласавы землякі», «Сваякі» з Валожына ды калектывы з іншых устаноў культуры раёна. Кожны госць змог знайсці сабе занятак па інтарэсах: дзеці каталіся на атракцыёнах, частаваліся салодкай ватай і марожаным. Дарослыя падпявалі самадзейным артыстам, танцавалі пад вясёлую музыку. А прыхільнікі народнай творчасці з цікавасцю абыходзілі імправізаваныя падворкі, дзе былі выстаўлены работы народных умельцаў: самаробныя абрусы, ручнікі, посцілкі. Ушанавалі падчас свята самага маленькага і самага старога жыхара вёскі.

— Дык якія ж людзі жывуць у Дубіне? — пацікавілася ў жыхароў напрыканцы фестывалю. Яны і расказалі, што дзевак з іх вёскі замуж не бяруць, што ў магазіне ўжо гадоў 40 дэфіцыт на ватоўкі. Як толькі прывязуць — уся вёска ў чарзе стаіць. А дубінскія жанчыны не прызнаюцца, адкуль родам — з-за таго, што нехта калісьці сказаў: «Разумныя людзі ў Дубіне і свіней не купляюць». Вось і зразумей: дзе праўда, а дзе прыдумка...

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

### Дубінскі анекдот

**Прыйшла Ганна да суседкі:**
**— Гэлька пазыч мне гароху, свайго не хапіла.**
**— Дык сама ж летась клялася, што больш ніколі не будзеш яго сеяць, бо ўсё роўна чарвякі з'ядуць.**
**— Тое ж летась было... А сёлета палову агарода гарохам засею. Хай трушчаць, хай ім праз бакі павылазіць.**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.37 | 21.43 | 17.06 |
| Віцебск — | 4.18 | 21.42 | 17.24 |
| Магілёў — | 4.27 | 21.34 | 17.07 |
| Гомель — | 4.33 | 21.21 | 16.48 |
| Гродна — | 4.54 | 21.57 | 17.03 |
| Брэст — | 5.04 | 21.48 | 16.44 |

## Месяц

*Апошняя квадра 17 чэрвеня.*
*Месяц у сузор'і Рыб.*

## Імяніны

*Пр. Ульяны, Івана, Нікіфара.*
*К. СВЯТА БОЖАГА ЦЕЛА І КРЫВІ, Віолы, Іяланта, Яны, Віта, Вітольда, Лявона.*



Фота Надзеі БУЖАН.

# ЗАЎТРА




### Даты Падзеі Людзі

#### 15 ЧЭРВЕНЯ

**Сусветны дзень ветру. Адзначаецца па ініцыятыве Еўрапейскай асацыяцыі ветраэнергетыкі і Сусветнага савета па энергіі вятроў з 2007 года.**

**1215** год — англійскі кароль Ян Беззямельны падпісаў Вялікую хартыю вольнасцяў, якая абмяжоўвала каралеўскую ўладу. Сёння ўваходзіць у лік дзеючых актаў Канстытуцыі Вялікабрытаніі.

**1667** год — прафесар матэматыкі, філасофіі і медыцыны Сарбоны Жан-Батыст Дэні ўпершыню выканаў паспяховае пераліванне крыві: ён пераліў 16-гадоваму юнаку, які пакутаваў на ліхаманку, 9 унцый (каля 250 кубічных сантыметраў) крыві ягняці, пасля чаго хворы хутка паправіўся. Гэты факт па праве лічыцца ўнікальным, паколькі аб існуючых групах чалавечай крыві даведаліся толькі праз 250 гадоў. Аднак наступныя спробы Дэні паўтарыць поспех нярэдка прыводзілі да трагічных наступстваў, і пераліванне крыві ў Францыі было забаронена. Толькі ў 1900 годзе аўстрыйскі ўрач Карл Ландштэйнер адкрыў першыя тры групы крыві — А, В і С. Неўзабаве да спіса былаададзена і чацвёртая — АВ.



**1790** год — нарадзіўся Антоній Ануфрый Плятэр, краязнаўца, археолаг, калекцыянер. З'яўляўся членам Віленскай археалагічнай камісіі. У выніку падарожжаў па Заходняй Дзвіне апісаў помнікі архітэктуры, археалогіі, гістарычныя мясціны, Барысавы камяні. Цікавіўся беларускім фальклорам. Сабраў шмат матэрыялаў з Падзвіння, частку з іх перадаў у Віленскі музей старажытнасцяў. Рукапісы захоўваюцца ў бібліятэцы Вільнюскага ўніверсітэта. Памёр у 1862 годзе.

**1843** год — нарадзіўся Эдвард Грыг, нарвежскі кампазітар, піяніст, дырыжор. Аўтар музыкі да драмы Г. Ібсена «Пер Гюнт», сюіты для струннага аркестра «З часоў Хольберга», канцэрта для фартэпіяна з аркестрам, струннага квартэта, «Лірычных п'ес» для фартэпіяна, рамансаў і песень. Памёр у 1907 годзе.

**1867** год — нарадзіўся Канстанцін Дзмітрыевіч Бальмонт, рускі паэт-сімваліст, адзін са славутых прадстаўнікоў паэзіі Сярэбранага веку. Памёр у 1942 годзе.

**1902** год — нарадзіўся (в. Параф'янава, цяпер у Докшыцкім раёне) Ян Бабровіч, публіцыст, дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі. Быў рэдактарам газет «Жыццё беларуса», «Беларуская ніва», «Беларуская справа», «Народная справа» і інш. У 1928 годзе арыштаваны і асуджаны да 15 гадоў турмы. У выніку абмену палітвязнямі ў 1932-м апынуўся ў Савецкай Беларусі, працаваў у Камісіі па вывучэнні Заходняй Беларусі пры АН БССР. У 1933 годзе рэпрэсаваны. Памёр у 1943 годзе ў лагеры. Рэабілітаваны пасмяротна ў 1956 годзе.

#### Было сказана

**Ніна МАЦЯШ, паэтэса:**
*«Няма нічога, акрамя жыцця і смерці. Шлях праўды не закончыцца на мне».*

### УСМІХНЕМСЯ

**Падарунак на вяселле больш правільна было б дарыць праз пяць гадоў шлюбу. Спачатку вы мне даказваеце, што ваша каханне вечнае, а потым я вам нешта куплю.**

— У цябе жонка працуе?
— Падзарабляе, некалькі разоў на год, ліквідатарам.
— Што ліквідуе?
— Усякае шмаццё ў гандлёвых цэнтрах падчас сезонных распродажаў.

**Калі ваша дзіця, наліваючы чай, нахіляе кружку, вы дапусцілі пару хібаў у выхаванні.**

Прыходзіць дадому муж п'яны, жонка на кухні мые посуд. Муж кулаком па стале:
— Хто ў доме гаспадар?!
Жонка яго патэльняй па галаве — бац! Мужык «у адключцы».

Заходзіць суседка:
— А што ў цябе мужык пасярод кухні ляжыць?
— Гаспадар! Дзе хоча, там і ляжыць.

**Для тых, хто не ходзіць на першыя пары, таму што рана ўставаць неахвота, паведамляем, што ў войску пад'ём у 6.00.**




caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.
Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2268.
Нумар падпісаны ў 19.30 14 чэрвеня 2017 года.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12